Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Вярхоўным судзе затрымалі 7 чалавек, якія прыйшлі падтрымаць "кандыдатаў пратэсту" дапоўнена

19.05.2020 **Тэгі**: суды, затрыманні



Акцыя групы "кандыдатаў пратэсту" каля ЦВК 15 траўня. Фота: Радыё Свабода".

У Мінску прама ў залах Вярхоўнага суда затрымалі людзей, якія прыйшлі на суд падтрымаць незарэгістраваных "кандыдатаў пратэсту" ад Мікалая Статкевіча. Пра гэта праваабаронцам "Вясны" паведаміла яго жонка Марына Адамовіч.

Па словах Адамовіч, былі затрыманыя 7 чалавек, сярод іх актывісты **Сяргей Спарыш, Арцём Бабок**, "кандыдатка пратэсту" **Анжаліка Жэлезнякова, Тамара Патоцкая, Уладзімір Неўмяржыцкі.**

Пазней быў затрыманы **Валянцін Фралоў,** які таксама прысутнічаў у Вярхоўным судзе. Пазней яго адпусцілі.

Таксама затрыманы **Юлія Лемехава** і **Дзмітрый Місюк.**

Людзі ў цывільным заходзілі ў судовыя залы, дзе ў той час ішло абскарджванне пастановаў Цэнтрвыбаркаму аб нерэгістрацыі часткі ініцыятыўных груп, і выводзілі людзей уніз да аўтобуса. Тры супрацоўніка міліцыі ў форме, якія таксама там знаходзіліся, ніяк не ўмешваліся.

Сяргей Спарыш паспеў зняць кароткае відэа падчас аднаго з затрыманняў.

Па апошняй інфармацыі, усіх затрыманых даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёна Мінска.

Дапоўнена: Пасля васьмі вечара жонцы Сяргея Спарыша пацвердзілі, што яе мужа перавезлі ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў. Верагодна, астатнія затрыманыя таксама правядуць ноч там.

Інфамацыя будзе дапаўняцца.

Твитнуть









мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік

2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY